# Сёння адкрываецца Менскі Дом Чырвонай Арміі

## Камандарму 1-га ранга тав. Убарэвічу, Армейскаму камісару 2-га ранга тав. Буліну

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ЦВК, СНК БССР і ЦК КП(б)Б горача віншуюць вас і ўсіх байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Беларускай ваеннай акругі з адкрыццём новага Дома Чырвонай Арміі ў менскім гарнізоне.

Гэты выдатны палац культуры, створаны па ініцыятыве жалезнага наркома абароны, маршала Совецкага Саюза Кліменція Ефрэмавіча Варашылава, дапаможа камандзірам, палітработнікам чырвонаармейцам выкарыстаць гэты дом для паляпшэння культурнай і палітычнай работы і вучобы і стане найлепшым месцам адпачынку для байцоў і камандзіраў доблесных часцей менскага гарнізона.

Клопаты аб Чырвонай Арміі, яе байцах, камандзірах і палітработніках у нашай соцыялістычнай краіне, кіруемай слаўнай комуністычнай Партыяй і вялікім правадыром народаў таварышам Сталіным, заўсёды стаяць на першым месцы.

Новы Дом Чырвонай Арміі, пабудаваны ў Менску, — яшчэ адно сведчанне гэтых клопатаў і вялікай любві працоўных нашай Совецкай Беларусі да сваёй роднай Чырвонай Арміі — абаронніцы соцыялістычнай бацькаўшчыны.

Большэвіцкае прывітанне байцам, камандзірам і палітработнікам Беларускай ваеннай акругі — слаўным абаронцам заходніх рубяжоў Совецкага Саюза!

Большэвіцкае прывітанне будаўнікам Дома Чырвонай Арміі!

| | | |
|---|---|---|
| Старшыня ЦВК БССР | Старшыня СНК БССР | Сакратар ЦК КП(б)Б |
| ЧАРВЯКОЎ. | ГАЛАДЗЕД. | ГІКАЛО. |